«Народная Воля» в Facebook www.facebook.com/nv.online.info,
в Vkontakte www.vk.com/nvonlineinfo

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 59 (4619)

6 жніўня 2021 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



Народная Воля

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

У Мінску ў закрытым працэсе судзяць Марыю Калеснікаву і Максіма Знака

Працэс закрыты, нават родных не пускаюць у залу пасяджэнняў. У той жа час распаўсюджваюцца здымкі, зробленыя набліжанымі да ўлад СМІ. Дэмакратыя па-беларуску!



Пазбаўлены ліцэнзіі адвакат **Сяргей Зікрацкі** раней бараніў **Максіма Знака**, ён ведае дэталі крымінальнай справы. У інтэрв'ю «Еўрарадыё» Зікрацкі заявіў:

– Як былы абаронца Максіма Знака, магу сказаць, што я не бачу ў гэтай крымінальнай справе ніякіх прычын, каб судовы працэс быў закрытым. На мой погляд, ён абвешчаны закрытым надумана, каб ніхто не зразумеў, якія канкрэтныя доказы ёсць у следства, якія доказы ёсць у пракуратуры ў абвінавачаннях Максіма Знака і Марыі Калеснікавай.

Мы абсалютна ўпэўнены, што ніякіх доказаў па тых артыкулах, якія ім выставілі, няма. І таго, пра што нам агучваюць у публічнай прасторы, Максім і Марыя не здзяйснялі.

Яны абсалютна не вінаватыя і цяпер за кратамі толькі таму, што выказвалі сваю пазіцыю і былі палітычна актыўнымі, абаранялі той выбар, які зрабілі ўсе мы.

Заўважым, **Марыя Калеснікава** і **Максім Знак** пад вартай з верасня 2020 года. Ім выставілі абвінавачанні па некалькіх артыкулах Крымінальнага кодэкса: «заклікі да дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь», «змова з мэтай захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам», «стварэнне экстрэмісцкага фарміравання і кіраўніцтва ім».

Хто яны такія?

Да мая 2020 года гэтыя прозвішчы былі вядомы толькі ў вузкіх колах. Марыя Калеснікава займалася арганізацыяй культурных імпрэз і музыкай, чытала лекцыі па гісторыі мастацтва. Максім Знак займаўся юрыдычнай дзейнасцю, выкладаў у БДУ, удзельнічаў у даследаваннях Сусветнага банка і праграмах ААН.

Пасля заявы **Віктара Бабарыкі** аб намеры ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах у якасці кандыдата абодва далучыліся да яго каманды і фактычна сталі яе тварамі. Менавіта Знак з Калеснікавай суправаджалі Бабарыку ў ЦВК падчас працэдуры рэгістрацыі, а таксама давалі каментарыі да выбарчай кампаніі свайго кандыдата.

Пасля адмовы ў рэгістрацыі Бабарыкі абодва ўвайшлі ў аб'яднаны выбарчы штаб **Святланы Ціханоўскай**. Па словах Марыі Калеснікавай, менавіта яна прапанавала **Веранiцы Цапкала** і **Святлане Ціханоўскай** аб'яднацца «пасля невялікай сумеснай размовы». Максім Знак суправаджаў Ціханоўскую ў будынак ЦВК на наступны дзень пасля выбараў 9 жніўня пры падачы скаргі на афіцыйныя вынікі галасавання.

Як доўга знаходзяцца пад вартай?

Неўзабаве пасля ад'езду з краіны Святланы Ціханоўскай была створана Каардынацыйная рада, у прэзідыум якой увайшлі таксама Максім Знак і Марыя Калеснікава. Абаіх выклікалі на допыты ў Цэнтральны апарат Следчага камітэту з гэтай нагоды. Знака і Калеснікаву затрымалі з розніцай у два дні – 7 і 9 верасня 2020 года. Абое з таго часу пад вартай. Марыя Калеснікава большую частку тэрміну адбыла ў следчай турме №8 у Жодзіне, Максім Знак – у мінскім СІЗА № 1 на вуліцы Валадарскага.

Следства ў справе Знака і Калеснікавай неаднаразова працягвалася, абвінавачаным выстаўлялі новыя артыкулы. Неўзабаве пасля затрымання 9 верасня Максім Знак, пратэстуючы супраць абвінавачання, абвяшчаў галадоўку.

ЛІСТ З РЭДАКЦЫІ

Спадзяёмся на далейшую дапамогу!

Шаноўныя прыхільнікі «Народнай Волі»!

У чарговы раз выказваем вам вялікі дзякуй за тыя ахвяраванні, якія Вы пералічваеце з тым, каб наша і ваша газета не знікла з інфармацыйнага поля.

Будзем шчырымі: толькі дзякуючы Вашай дапамозе мы працягваем нашу творчую працу, назіраючы тыя перамены, пра якія марыць мільёны беларусаў. Таму ў чарговы раз нагадваем: падпісацца на PDF-версію газеты можна на сайце **belpressa.by**. Паколькі рэдакцыя ўжо працяглы час не мае даходаў ад рэалізацыі выдання праз «Белпошту» і «Белсаюздрук», то мы рэальна зацікаўлены ў павелічэнні падпісчыкаў на PDF-версію.

Па-ранейшаму звяртаемся да тых, хто **дадаткова** мае магчымасць праявіць адрасную дабрачыннасць. Ёсць некалькі спосабаў пералічыць грашовыя сродкі (даём рэквізіты ў рускай транскрыпцыі) на рэдакцыйны рахунак.

1.Через ЕРИП:
СМИ – Н (просто буква) – «Народная Воля» – Добровольные взносы.
2.Через БАНК:
ИЧУП «Народная Воля». 220030 г.Минск, ул.Энгельса, 34а
р/с BY08 PJCB 3012 0065 3510 0000 0933, Код PJCBBY2X, ЦБУ 113 «Приорбанк» ОАО, г.Минск
УНП 100961759, ОКПО 37381505

Загадзя выказваем шчырую ўдзячнасць!

Вы – з «Народнай Воляй», «Народная Воля» – з Вамі!

ТАМ, НА ПАЛЕТКАХ

Жніво пераваліла экватар



Абмалот збожжавых у Беларусі вядзецца ўжо з другой паловы плошчаў. Магчыма, у гэты час, калі вы, шаноўныя прыхільнікі "Народнай Волі", чытаеце газетныя радкі, агульны збор зерня дасягнуў чатырох мільёнаў тон. Сярэдняя ўраджайнасць з гектара ў межах 32 цэнтнераў.

Самыя ўрадлівыя палеткі, як заўсёды, на Гродзеншчыне і Міншчыне.

ЗАКУЛИСЬЕ

К Чижу снова приходили судебные исполнители

Они осмотрели территорию участка, на котором стоит его дом, однако в коттедж так и не попали.

Это уже не первая попытка судебных исполнителей войти в дом Чижа. Вот что говорил "Народной Воле" по этому поводу адвокат **Михаил Макаров**.

«Вступило в законную силу решение суда Центрального района города Минска о принудительном вскрытии дома Чижа в Логожеске, – объясняет адвокат. – *Все это происходит в рамках взыскания долга, который причитается* ***Николаю Чукисову.*** *Сумма долга – около 300 тысяч белорусских рублей – это по исполнительному производству 2019 года, но все длится по сей день».*

Адвокаты Юрия Чижа пытались обжаловать решение суда, но безуспешно – оно вступило в законную силу.

В минувшую пятницу, 30 июля, судебные исполнители снова попытались войти в дом Чижа. И даже дошли до него, открыли ворота. Однако на этом все и закончилось. Как рассказали «Народной Воле» очевидцы событий, *«сторона должника подала жалобу на действия судебного исполнителя».*

«Видимо, должника и его представителей не надлежащим образом известили, поэтому судебные исполнители отказались от продолжения действий в этот день – они перенесены на иную дату», – пояснил «Народной Воле адвокат Чукисова.

Если ничего не поменяется, то после 13 августа судебные исполнители снова намерены попасть в дом Чижа, чтобы все-таки взыскать с него долг.

Официальных новостей по уголовному делу основателя кампании «Трайпл» по-прежнему нет – КГБ молчит, а Юрий Александрович находится под стражей.

Марина ВИШНЕВСКАЯ.

СТАЛА ВЯДОМА...

Мацкевіч і Вадалаская – у турме на Акрэсціна

Як вядома, 4 жніўня сілавікі затрымалі **Уладзіміра Мацкевіча, Таццяну Вадаласкую, Улада Вялічку** і **Юрася Меляшкевіча**.

Намеснік старшыні партыі БНФ **Юрый Меляшкевіч** 5 жніўня паведаміў у Фэйсбуку, што ён на волі:

"Сябры, дзякуй за падтрымку і неабыякавасць! Зараз я на волі і ўжо вярнуўся ў Мінск. У дачыненні да мяне праводзіцца праверка. Сітуацыя выглядае абсурднай, але нічога не зробіш. Спадзяюся на лепшае".

Затрыманы раніцай 4 жніўня – старшыня міжнароднага кансорцыума «ЕўраБеларусь» **Улад Вялічка** – ужо ўвечары быў на волі, пра гэта паведаміла яго жонка Алена Вялічка.

Тым часам стала вядома, што таксама затрыманага пазаўчора метадолага **Уладзіміра Мацкевіча** перавялі ў ІЧУ на Акрэсціна. Пра гэта са спасылкай на ягоную сястру паведаміў **Андрэй Ягораў**.

Паводле тэлеграм-канала "Спісы затрыманых", у турме на Акрэсціна знаходзіцца таксама **Таццяна Вадалаская.**

Уладзімір Мацкевіч – заснавальнік і кіраўнік Агенцтва гуманітарных тэхналогій, першы кіраўнік рады міжнароднага кансорцыума "ЕўраБеларусь" (2011–2016), заснавальнік праграмы стварэння сучаснага ўніверсітэта ў Беларусі "Лятучы ўніверсітэт", вядоўца тэлепрадач. Удзельнічаў у ініцыятыве "Сход".

Таццяна Вадалаская – старшы аналітык Цэнтра еўрапейскай трансфармацыі. Эксперт аналітычнай групы Агенцтва гуманітарных тэхналогій. Кандыдат сацыялагічных навук.

ЗАКУЛИСЬЕ

Александр ЯНОВСКИЙ: «Жизнь дается не только для работы...»

Бывший генеральный директор ОАО «Керамин» хотел, чтобы после его ухода предприятие возглавил один из его заместителей. Однако генеральным назначили человека со стороны.

Напомним, что столичный завод недавно возглавил экс-глава Центрального района Минска 38-летний **Дмитрий Петруша**.

А.Лукашенко сказал, что у него есть вопросы к управлению «Керамином»: «Управление никакое. Исходя из прошлого года, мы видели ряд недостатков по тому, как вели себя отдельные работники… Все это зависит от нас, от управленцев».

Прежний гендиректор **Александр Яновский** *возглавлял «Керамин» с 2012 года.*

Лукашенко пообещал Дмитрию Петруше всяческую поддержку предприятия.

А экс-директор говорил, что всегда был категорическим противником господдержки и лишней опеки предприятий: *«Государство сегодня должно отвечать по инфраструктурным проектам: дороги, трубопроводы, АЭС. Общегосударственные проекты должны финансироваться из бюджета. А коммерческие структуры, даже со 100-процентной долей государства, должны жить за счет своей деятельности. Если не могут – значит, не надо туда заталкивать деньги, которые никогда оттуда не вернешь.*

Доля государства в коммерческих структурах должна уменьшаться. Мне кажется, присутствие государства в экономике сегодня избыточно. Я вас уверяю: нам с завода не хуже видно, что делать с предприятием, чем, скажем, из Дома правительства. Это совершенно точно».

Уже сразу после назначения новый гендиректор «Керамина» рассказал, что у него много планов.

«Стоит задача – выйти на доковидный уровень производства и реализации продукции, где-то, может, новые доли рынка занять, где-то, может быть, войти, где мы не были представлены, – *уверенно заявил Дмитрий Петруша.* – *Одна из основных задач – это работа с коллективом, там 2300 работающих. Это люди, каждый человек особенный, каждый человек личность. Руководству в первую очередь нужно будет подойти индивидуально -- было поручено главой государства. Конечно, с этой задачей, я полагаю, мы тоже справимся. Особых сложностей не будет».*

Про коллектив предприятия разговор был совсем не случайным. Дело в том, что в августе минувшего года работники «Керамина» поддержали идею о всеобщей забастовке и вышли на улицу. Люди выступили против насилия и фальсификаций результатов выборов. К бастующим, которые предлагали полностью остановить работу завода, вышел тогдашний гендиректор предприятия **Александр Яновский**. Он сказал, что если большинство членов коллектива проголосуют за то, чтобы остановить завод – значит, так тому и быть. Слова Яновского поддержали аплодисментами. На вопросы журналистов о том, бастует ли завод, руководство предприятия отвечало так: мол, в свободное от работы время люди имеют право выражать свою гражданскую позицию, в этом им никто препятствовать не может.

Оказалось, что Яновский ушел с «Керамина» около четырех месяцев назад. Несколько лет назад, отвечая на вопрос «Народной Воли» о том, как бы хотелось закончить свою директорскую карьеру, Яновский ответил так: *«Мне хотелось бы закончить ее на «Керамине». Уйти со спокойной совестью, оставить успешный завод. Хотелось бы, чтобы, когда я уйду, кто-то из моих заместителей сел на мое место….».*

«Народная Воля» поинтересовалась, как сегодня дела у Яновского.

– Все нормально, четвертый месяц на пенсии, – *ответил Александр Владимирович.*

– Я и не знала, если честно, что вас так давно нет на заводе…

– Добро на назначение нового директора дали совсем недавно.

Я сам написал заявление на увольнение. Министр этого сильно хотел. Нет здесь никаких подводных камней. Честно говоря, надоело все это…

Единственное, обидно, что назначили не кого-то из моих заместителей, для которых этот завод действительно важен, они жили им. Но с этим уже ничего не поделаешь!

Я для себя решил, что жизнь человеку дается не только для работы, но еще и просто для жизни. Иначе можно не успеть пожить. Не хочу сказать, что я собираюсь в другой мир, но мы же понимаем, сколько у нас мужики живут… Я 30 лет отработал на руководящих должностях, сейчас поживу без работы немного, для себя…

Марина КОКТЫШ.

ПОЗДРАВЛЯЕМ!

Медаль Ирины Курочкиной

Ирина Курочкина завоевала серебро XXXII Олимпийских игр.



Для белорусской олимпийской сборной это третья награда на Олимпиаде в Токио и первая серебряная. Ранее золото завоевал **Иван Литвинович**, а **Максим Недосеков** – бронзу.

В медальном зачете Беларусь сейчас занимает 47-е место. Она находится на одной позиции с Эфиопией, Угандой и Филиппинами.

ПОЗОР!

Шантаровичу сказать нечего…

Перед Олимпиадой титулованный тренер по гребле на байдарках и каноэ **Владимир Шантарович** был на удивление многословным. Подтверждая политическую лояльность белорусскому руководству, он как только не поносил европейских чиновников. «Больным людям надо подлечиться – такое мое мнение», – этими словами заканчивалось одно из его высказываний о депутатах Европарламента, которые осуждают репрессии в Беларуси.

Много, видимо, сил отдал Владимир Шантарович на изобличение «врагов белорусских властей», коль на этот раз оказались слабо подготовленными его подчиненные спортсмены. Как выяснилось, двойка в составе известных **Марины Литвинчук** и **Ольги Худенко** слабее соперниц, а потому и лишилась медалей. Ни одна из белорусок не пробилась даже в финал А. Такой же неуспех постиг и каноистку **Елену Ноздрову**. Лишь седьмыми пришли к финалу **Олег Юреня** и **Никита Бориков**.

После того, как спортсмены потерпели фиаско, господину Шантаровичу было не с чем выйти к прессе. Общаться с журналистами он отправил помощника **Геннадия Галицкого**.

Федор КУЗЬМЕНКО.

ПОЗДРАВЛЯЕМ!

Долги белорусов по кредитам приближаются к рекордной отметке

Задолженность физлиц по кредитам на 1 июля составила 15 миллиардов 792,4 тысячи рублей, сообщает Нацбанк. В общей сумме учитываются потребительские кредиты, кредиты на недвижимость, на авто, а также карты рассрочки. При этом задолженность по потребительским кредитам продолжает снижаться, а по кредитам на недвижимость по-прежнему растет.

По сравнению с началом этого года общий объем задолженности по кредитам физлиц вырос на 89,9 миллиона рублей. При этом за февраль и март этот показатель снизился, а с апреля возобновился рост.

При этом объем задолженности по потребительским кредитам снижается с сентября 2020 года. На 1 июля текущего года этот показатель составлял 5 миллиардов 241,1 миллиона рублей. Эта сумма на 22 миллиона рублей меньше, чем месяцем ранее. Минувшей осенью банки ужесточали условия выдачи кредитов из-за нехватки ликвидности.

Объем кредитов на недвижимость прирастает каждый месяц. Задолженность физлиц по этому виду кредитования на 1 июля составила 10 миллиардов 467,7 миллиона рублей. По сравнению с предыдущим месяцем сумма увеличилась на 93,7 миллиона рублей. Банки минувшей осенью также ограничивали кредитование недвижимости, но в начале нынешнего года начали возобновлять это кредитование. Примечательно, что на протяжении всего 2020 года и в этом году долги белорусов перед банками по недвижимости растут.

СПАТКАННЕ

Ігар ІЛЬЯШ:

«Гэта былі цудоўныя суткі – безумоўна, самыя шчаслівыя з моманту арышту Каці»

Вядомы журналіст Ігар Ільяш днямі меў доўгатэрміновае спатканне з жонкай, якая вось ужо пэўны час знаходзіцца ў калоніі. Ён кажа, што на здароўе Кацярына не скардзіцца. Ліст ад Юрыя Васкрасенскага з просьбай напісаць прашэнне аб памілаванні на імя Лукашэнкі Кацярына Андрэева атрымала, але не стала нічога на яго адказваць. Яе пазіцыя не змянілася – ніякага прашэння пісаць яна не будзе.

"3–4 жніўня ў нас з Кацяй адбылося першае за час яе зняволення доўгае спатканне. Гэта былі цудоўныя суткі – безумоўна, самыя шчаслівыя з моманту арышту Каці. Мы амаль адразу забыліся пра калючы дрот, платы і краты. Мы цалкам пагрузіліся ў свет, створаны нашым каханнем. І свет гэты (я ў чарговы раз у гэтым пераканаўся) аказаўся абсалютна непрыступным для працяглай разлукі і наогул усіх выпрабаванняў, з якімі мы сутыкнуліся за апошні год.

Нядаўнія падзеі толькі памножылі нашы эмоцыі: крыху больш за тыдзень таму я сядзеў на Акрэсціна, і мы нават не спадзяваліся, што гэта спатканне ў выніку адбудзецца. Цяпер жа мы ўпершыню з лістапада апынуліся ў абдымках адно аднаго. Думаю, не кожнае рамантычнае падарожжа ў Парыж або Рым здольнае прынесці гэтак жа яркія пачуцці і эмоцыі, якія мы перажываем падчас гэтага спаткання ў калоніі.

Каця перадае ўсім прывітанне і просіць прабачэння, што не можа адказаць на кожны ліст. Каця не скардзіцца на здароўе, яна ўпэўнена ў сваіх сілах і глядзіць у будучыню з аптымізмам. І што вельмі важна: турма яе ніяк не змяніла.



"Мая задача – захаваць душу ад распаду і не дазволіць зоне пракрасціся ў мяне. Не стаць часткай выродлівага (турэмнага свету), а зрабіць трохі больш цудоўнай прасторы вакол сябе", – сказала Яна".

***

Журналістка "Белсата" Кацярына Андрэева, як і яе калега Дар'я Чульцова знаходзіцца за кратамі з 15 лістапада 2020 года. Іх затрымалі ў кватэры на "плошчы Перамен" у Мінску, адкуль яны вялі стрым для тэлеканала "Белсат". У кватэры выламалі дзверы, усярэдзіну забеглі спецназаўцы.

Спачатку іх асудзілі на 7 сутак за "ўдзел у несанкцыянаванай акцыі і непадпарадкаванне". Потым абвінавацілі ў арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак. 18 лютага ім прысудзілі па 2 гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

ТРАГЕДЫЯ

На месцы гібелі Віталя Шышова стварылі мемарыял

Праз тры дні пасля гібелі Віталя Шышова ягоныя сваякі і сябры стварылі мемарыял на месцы, дзе яго знайшлі павешаным, паведаміў «Беларускі дом ва Украіне».

Каля партрэта Віталя паставілі вянок, кветкі, зьнічы, узнялі бел-чырвона-белы сцяг.

Адзін з заснавальнікаў і фармальны кіраўнік «Беларускага дома ва Украіне» Віталь Шышоў зьнік раніцай 2 жніўня ў Кіеве, куды перабраўся з Беларусі ўвосень 2020 года разам з дзяўчынай. Паводле сяброў, ранкам ён звыкла пайшоў на прабежку і не вярнуўся.

Шышоў быў адміністратарам тэлеграм-канала «Беларускі дом ва Украіне», таксама адміністраваў сайт арганізацыі. Рыхтаваў у Кіеве акцыі, звароты, здымаў і мантаваў відэа з акцый. Дапамагаў уцекачам з Беларусі прадуктамі і рэчамі. Працаваў праграмістам-фрылансерам.

Трэцяга жніўня яго знайшлі павешаным у Святошынскім парку Кіева непадалёк ад ягонага дома. На цела натрапілі прадстаўнікі «Беларускага дома ва Украіне», якія раніцай аднавілі пошукі. На твары Шышова былі сляды збіцця, прызначана экспертыза.

Агучваюцца розныя версіі смерці нашага суайчынніка. Былы міністр замежных спраў Украіны **Паўло Клімкін** у сваім Фэйсбуку выказаў упэўненасць, што Шышова забілі спецслужбы Беларусі. Кіраўнік аддзела расследаванняў Bellingcat **Хрыста Грозеў** заявіў, што ў апазіцыйныя беларускія структуры ва Украіне інтэграваліся супрацоўнікі расійскага ФСБ пад прыкрыццём; ён таксама не выключыў, што Шышова забілі менавіта яны.

Прадстаўнік «Беларускага дома ва Украіне» **Юрый Шчучко** сказаў, што актывісты «Беларускага дома ва Украіне» атрымлівалі інфармацыю, у тым ліку з СБУ, што ва Украіну прыязджаюць прадстаўнікі беларускіх спецслужбаў «для фізічнага знішчэння нашых актыўных членаў».

Паплечнікі Шышова паведамляюць, што ён неадназова заўважаў за сабой сачэнне.

Кіраўнік Нацыянальнай паліцыі Украіны **Ігар Кліменка** 3 жніўня назваў дзве асноўныя версіі гібелі беларуса, якія разглядае яго ведамства: самагубства і забойства з імітаваннем самагубства. А таксама сказаў, што сам Шышоў з паведамленнямі пра сачэнне за сабой у паліцыю ніколі не звяртаўся.

Дзяўчына Шышова – Бажэна Жолудзь, якая таксама находзіць з Рэчыцы, узгадала, што ў Віталя ў апошнія тыдні былі кепскія прадчуванні, таксама яна ўспомніла, што да яе ў цэнтры Кіева падыходзілі незнаёмыя, каб высветлілася, каб здымаць на відэа. Суіцыдальных думак яна ў свайго хлопца не заўважала.

ЗВАНЫЙ ГОСТЬ

Иван МИСЬКО, народный художник:

«Лученок был ершистым по сути»

*Сегодня, 6 августа, на Аллее славы Восточного кладбища открывается памятник народному артисту СССР **Игорю Лученку** – событие приурочено ко дню рождения композитора. Надгробный мемориал создан скульпторами **Иваном Мисько**, **Александром Финским**, и архитектором **Владимиром Крамаренко**. Накануне я встретилась с народным художником Иваном Якимович МИСЬКО, который был близким товарищем великого белорусского композитора-песенника. Он рассказал:*

– Сейчас я работаю над рельефом Игоря Лученка, хочу выставить его на персональной выставке в честь своего 90-летия. Юбилей через полгода. Время идет, остановить его невозможно, и надо успеть. Кстати, о времени. Однажды с Лученком мы были на Московском (*Восточном*. – **Ред.**) кладбище, и он мне говорит: «Ты посмотри, какие нахалы – все места уже позанимали». – «Ты торопишься?» – «Нет. Но надо думать и об этом…».

– Игорь Михайлович любил пошутить. Вообще у него, мне кажется, был типаж вечного юноши: поджарый, оптимистичный, с молниеносной реакцией…

– Он был непредсказуемый, поэтому с ним надо было быть осторожным. Мог и вспылить, обидеться, собраться и уйти. Я долгое время хотел снять маску с его руки, и все ждал момента, чтобы затеять этот разговор. И не получалось… Но однажды все-таки словил его хорошее состояние, осторожно так начал: «Какая красивая у тебя рука… Дай-ка сниму с нее маску». – «Зачем?» – «Для истории!». Задумался… Протянул правую руку. «Почему правая?» – «Она рабочая». Ну, я тут же взялся за работу. Вон стоит теперь слепок около стенки. Я очень доволен.

– А правда, у композитора была рабочая рука – сильная, с крупными венами. Как у молотобойца… А с натуры Игоря Михайловича вы много лепили? А на рельефе Юрий Михайлович у вас у вас мятежный…

– Бурляций. Было трудно уловить



Иван Мисько и Игорь Лученок в мастерской.

состояние Лученка – чтобы это был композитор!

– Тем более Игорь Михайлович был не приглаженный даже внешне.

– А как только делаешь его гладеньким, то нет Лученка! Он был ершистым по сути. С ним только столкнешься на улице, и сразу лавина информации. Думаю, что со временем такому человеку в Минске надо установить памятник. Создана комиссия по увековечиванию его памяти, но она пока ни разу не собралась. Чем мы хороши, так это поговорить: «Это сделаем, это сделаем». И – забыли.

– В последний год правительство не до мастеров культуры, это понятно.

– А знаете, что сейчас у меня в замыслах? Хочу сделать скульптуру о ковид-19.

– О пандемии?!

– Женское лицо, маска, шапочка. Ищу образ. Один вариант уже сделал, но не могу остановиться: мучает, преследует меня эта идея.

– Что, кто-нибудь из вашей семьи болел ковидом?

– Никто. И меня пронесло. Мимо, мимо… Уже и прививку сделал.

– Вы очень хорошо выглядите. И одеты так элегантно.

– Стараюсь. Это у меня пижонство такое.

– Расскажите, у вас есть секреты здоровья и долголетия?

– Никаких секретов. Встаю в пять утра, попью водички и в семь выхожу на работу. В мастерской пью кофе. С корицей, сливками и сухарями. Посижу, подумаю: «Надо заварить себе чаю». Но почему-то рука опять тянется за кофе. А когда-то, в юности, вкуса кофе я просто не понимал! А сейчас кофеман. Полезно, не полезно – шут его знает.

– Вы часто обращаетесь к врачам? Я имею в виду профосмотр.

– Два раза в год.

– Вас оставили в лечкомиссии?

– Нет. Ни одного народного в лечкомиссии не оставили. А когда строили, говорили: «Это все для вас, для вас…»

– Разделили художников и чиновников… А раньше к вам в мастерскую чуть ли не все секретари ЦК переходили в гости.

– И Машеров, и Кузьмин, а Дементей даже позировал мне. Много было гостей. Я ведь зациклился на теме космонавтики.

– А это тема государственная.

– А космонавт Олег Новицкий, который и сейчас на орбите, мне трижды с корабля уже звонил. Вообще у нас с ним одна тема: инопланетяне. Какими они могут быть? Я ему говорю: «Подскажи, ты же был в открытом космосе!» Я хочу сделать такую скульптуру к открытию своей персоналки.

– Вы верите в существование иных миров?

– Верю! И отказаться от этого замысла никак не могу.

– А в Господа Бога?

– Верю во Всевышнего. Но не верю священникам. Мне часто непонятно их поведение. И знаете, хорошо, что ко Всевышнему нельзя обратиться запросто. Иначе бы люди задали столько глупых вопросов. У Него был бы инфаркт или инсульт. Ну, я бы тоже не удержался от вопросов, наверное.

– Иван Яковлевич, вы однолюб во всем: одна стратегия – космическая – тема в искусстве, один брак в судьбе. Кстати, ваша жена – дочка большого партийного босса, бывшего секретаря ЦК Владимира Мицкевича. Хороший был человек?

– Для меня – да. Полешук… А для всех быть хорошим нельзя.

– Вас часто подкалывали, что благодаря тестю творческие заказы получали?

– Никогда. И я от него лично ничего не получал.

– А квартира на Броневом переулке?

– Это ж его дочки квартира.

– То есть, когда вы поженились, у нее уже была эта жилплощадь?

– Да. Ирина ведь была замужем, она разошлась, чтобы соединиться со мной.

– Так вы отбили свою Ирину у другого?

– Отбил. Как увидел на переходе возле ГУМа, так и пошел за ней. Ноги красивые, осанка… А через два месяца сыграли свадьбу.

– А Мицкевич вас быстро принял как члена семьи?

– Как-то мы довольно легко подружились. А Ира молодец, самое главное ее качество, она не мешала мне работать в мастерской. Хотя и контролировала, не без этого. Жена! А я ведь в мастерской с утра до вечера. И так всю жизнь.

Елена МОЛОЧКО.

ПАЗІЦЫЯ

Марыя КАЛЕСНІКАВА:

«Лукашэнка забыўся, што жыць яму не з Пуціным»

У дзень пачатку суда над Марыяй Калеснікавай расійскі тэлеканал «Дождь» апублікаваў інтэрв'ю, якое яна дала з-за кратаў напярэдадні.

– Неўзабаве вашу справу будуць разглядаць у судзе. Што вы цяпер можаце расказаць пра гэтыя абвінавачанні?

– Абсурднае абвінавачанне, паводле якога нам з Максімам Знакам пагражае да 12 гадоў за тое, чаго мы не ўчынялі, – гэта сведчанне праваой сваволі паліцэйскай дзяржавы. Улада панічна баіцца адкрытага працэсу, дзе ўсе пабачаць, што насамрэч галоўнай небяспекай і пагрозай для беларусаў, Беларусі і нацыянальнай бяспекі сама ўлада і ёсць.

– Ці вам за ўвесь гэты час прапаноўвалі супрацоўнічаць? Мо напісаць прашэнне аб памілаванні ці прызнаць віну ў абмен на свабоду?

– Так, у розных формах, але, прапануючы, яны і самі не надта каб верылі ў маю згоду. Я сама прапаную ініцыяваць дыялог, перамовы, каб спыніць супрацьстаянне ў грамадстве. Мяне «пачулі» і прапанавалі здымацца ў кіно а-ля Раман [Пратасевіч]. Адказала, што Маркаў (*кіраўнік АНТ. – РС*) можа прыйсці, я падрабязна апавяду шокавую праўду пра выкраданне, следства і беззаконне ў турме. Нешта не прыходзіць. Паколькі я невінаватая, то выключаю магчымасць напісання прашэнняў.


– Калі будуць такія прапановы, як бы вы адрэагавалі?

– Гэта банда подлых баязлівых напарстачнікаў, і дзіўна было б ім давяраць. Яны ж заўсёды хлусяць. Не вер, не бойся, не прасі і смейся – гэта мой прынцып адносін з імі.

– Што вы думаеце пра людзей, якія пагаджаюцца на такія ўмовы для выхаду на свабоду?

– Ні ў якім разе нікога не асуджаю. Кожны з нас сам робіць свой выбар, зыходзячы з абставін, у якіх знаходзіцца, і сам нясе за яго адказнасць, найперш перад сабой.

– Ці вам удаецца неяк атрымліваць навіны? Ці можаце неяк сачыць за тым, што адбываецца ў краіне?



– Часткова ад адвакатаў, дзяржаўных газет і ТБ. Не заўжды зразумела, праўда, ці то БТ – філія КДБ, ці то наадварот. Смешна, як яны ўжо больш за год наперабой даказваюць адно аднаму, што іх большасць, але не 3%.

– Вы, пэўна, чулі пра прысуд Віктару Бабарыку. Ці чакалі, што ён будзе такім суровым?

– Не сумнявалася, што ён будзе суровым. Бо чым слабейшая ўлада, тым суровейшы прысуд. Віктар Дзмітрыевіч ужо больш як год у турме, але ў яго высокі рэйтынг, ён не здрадзіў сабе, не пайшоў на здзелку з сумленнем, нягледзячы на тое, што яго сын, блізкія і каманда ў закладніках. Яны баяцца яго, бо самі ні на што, апроч гвалту, не здатныя.

– Хутка будзе год пасля вашага затрымання. Ці чакалі, што прабудзеце ў СІЗА гэтак доўга? Ці думалі пра гэта?

– Я ведала, што, застаўшыся ў Беларусі пасля 9 жніўня, лёгка і проста не будзе, але я была да гэтага гатовая. А 7 верасня я ўвогуле не была ўпэўненая, што застануся жывой і гэта "не апошні панядзелак" у маім жыцці. Праз год я жывая – і гэта не можа не радаваць!

– Ці шкадуеце пра нешта цяпер, праз год? Ці дапускалі, што лепш варта было з'ехаць?

– Ні пра што я не шкадую, лічу, што парваць пашпарт, выключыўшы сваю дэпартацыю, – адзінае правільнае рашэнне. Выявілася, што ўсе чуткі пра магутнасць КДБ моцна перабольшаныя, і аднаго руху рукі дастаткова, каб усе іхныя баязлівыя планы рассыпаліся ўшчэнт. Зло абавязкова пераігрывае само сябе.

– Год пасля выбараў. З якімі эмоцыямі вы ўспамінаеце той жнівень і падзеі, якія адбыліся далей? Ці з'явілася расчараванне, ці мо наадварот?

– Усё лета – абсалютны драйв, мора пазітыву, дабра, усмешак і любові. Было складана, але гэта было таго варта. Расчараванняў няма, а вось захапленняў – акіян! Захапленне неймавернымі беларусамі і непераадольным імкненнем да свабоды, гатоўнасцю за яе змагацца.

– Як сітуацыя можа развівацца далей? Што павінна здарыцца, каб яна ў Беларусі змянілася?

– Сітуацыя мяняецца гэтак імкліва, што ў стане турбулентнасці немагчыма нешта прагназаваць. Ясна, што бяздушныя ўчынкі ўлады, рэпрэсіі, зачысткі медыя- і інфаполя, «Боінг» (*пасадка самалёта з Пратасевічам.* – **Заўв. «Дождь»**), мігранты, забойства бізнесу і паталагічная няздатнасць пралічваць наступствы сваіх дзеянняў хоць на крок-два наперад на тле поўнай адсутнасці даверу народу і зваротнай сувязі немінуча вядзе да яе [улады] краху.

– Ці на некага і на нешта разлічваеце цяпер у гэтым пытанні?

– Думаю, што і цяпер беларусы маглі б самі вырашыць свае праблемы, але для гэтага патрэбны палітычная воля, мудрасць і смеласць. Пачаць дыялог з народам – гэта адзінае, што відавочна задаволіла б усіх і адвяло б краіну ад краю прорвы, да якой так няўмольна вядзе ўлада.

– Ці могуць еўрапейскія санкцыі неяк паўплываць на тое, што адбываецца? Ці павінны заходнія краіны рэагаваць на падзеі ў Беларусі і як?

– Для беларусаў вельмі важная падтрымка міжнароднай супольнасці, важна ведаць і адчуваць, што ў сітуацыі тэрору і «звар'яцелага катка» мы не адны.

– У мінулых інтэрв'ю мы абмяркоўвалі з вамі і ролю Расіі ў тым, што адбываецца. Расійскія ўлады падтрымліваюць Аляксандра Лукашэнку, прынамсі на афіцыйным узроўні. Наколькі вялікая роля Расіі ў тым, што адбываецца цяпер у Беларусі, і ў тым, што Аляксандр Лукашэнка захаваў пост?

– Ніхто не дапускае думкі, што кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі давярае Лукашэнку ці хоць на ёту верыць ягоным абяцанням. Мы не ведаем, ці ёсць падтрымка насамрэч і ў чым яна выяўляецца, апроч размоваў пра яе. Факты – упартая рэч: банк «Газпрома» знішчаны, топы ў турме, [Соф'я] Сапега ў Мінску, самалёты ў Крым так і не паляцелі і гэтак далей. Усе размовы пра «падтрымку» – пыл у вочы. Але відавочна, што Лукашэнку працэй на каленях паўзці па «падтрымку», чым спыніць супрацьстаянне ў Беларусі. Ён, відаць, забыўся, што жыць яму не з Пуціным, а з беларусамі.

– Ці разлічвалі вы напачатку на падтрымку Расіі?

– Не. Як штаб Бабарыкі мы прынцыпова былі супраць умяшання іншых краін ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь. Калі Лукашэнка развязаў вайну супраць нас, мы прапаноўвалі пачаць дыялог сваімі сіламі альбо пры пасярэдніцтве РФ, ЕС і АБСЕ. Гэта наша сумленная і паслядоўная пазіцыя. Я і цяпер лічу, што толькі дыялог дазволіць выйсці з крызісу.

– Што вы хацелі б сказаць беларусам?

– Я веру ў беларусаў і люблю Беларусь. Перажываю за ўсіх, але ведаю, што зло абавязкова пераіграе само сябе, а дабро абавязкова пераможа. Нашы маленькія крокі вядуць да вялікіх перамог. А свабода і будучыня Беларусі вартыя таго, каб за іх змагацца. Разам пераможам!

З-ЗА КРАТАЎ

Максім ЗНАК:

«Ніхто не мог прадказаць маштабы і асіметрыю рэпрэсій»

У дзень пачатку суда над Максімам Знакам і Марыяй Калеснікавай і французскае Le Courrier d'Europe centrale і бельгійскае La Libre Belgique выданні апублікавалі інтэрв'ю, якое Максім Знак даў з-за кратаў.

– Якія вашы ўмовы ўтрымання? Да чаго вы змаглі прывыкнуць?

– Вядома, умовы ўтрымання цяпер лепшыя, але я дакладна ведаю, што яны могуць пагоршыцца ў кожны момант. Чалавек прывыкае да ўсяго, а ў беларусаў прывыканне да цяжкасцяў лічыцца нацыянальнай асаблівасцю!

У пэўным сэнсе я прызвычаіўся да затрымання, і дні ідуць, напоўненыя дзейнасцю, якая можа падацца звычайнаму чалавеку вельмі дзіўнай. Я спрабую адзначаць гэтыя абсурдныя і трагікамічныя моманты.

Калі падумаць, ёсць некаторыя рэчы, да якіх проста нельга прывыкнуць. Напрыклад, немагчымасць атрымаць пэўныя дробязі -- кефір, колу, бананы, маліны, тачылку для алоўкаў... Часам адсутнічае нешта абстрактнае, чаго я раней не ацэньваў і нават не заўважаў. Акрамя відавочных рэчаў, якіх, магчыма, нестае, самым цяжкім для мяне было прывыкнуць да адсутнасці цемры і адзіноты.

Добра, што мы – тыя, хто ў такой жа сітуацыі, як і я, – не прывыкаем да гэтага цалкам. Таму што прывыкнуць да гэтага азначае прыняць навязаную думку: вы заслугоўваеце гэтага, вы злачынцы, і нічога страшнага няма ў тым, што вы не можаце зрабіць большую частку таго, што могуць зрабіць нармальныя людзі. Але мы не згодныя, проста не прывыкаем.

– Вы самі юрыст. Якую ролю вы адыгрываеце ў сваёй уласнай судовай справе?

– На жаль, аднаго з маіх адвакатаў **Сяргея Зікрацкага** пазбавілі ліцэнзіі. Маю абарону забяспечваюць спецыялісты ў крымінальным кодэксе – **Дзмітрый Лаеўскі** і **Яўген Пыльчанка** – што не мая спецыяльнасць. Юрыст **Надзея Знак** дапамагае аб яднаць абарону, уважліва ставіцца да кожнай дэталі справы, шукае карысныя кроплі інфармацыі ў акіяне дадзеных. Мае адвакаты фантастычныя! Назіраючы за справай звонку, лягчэй весці абарону, заставацца бесстаронннім і, такім чынам, лепш разумець, як можна інтэрпрэтаваць дакументы ў судзе.

Але я не чужы ў сваёй справе: вы не можаце сабе ўявіць, з якім энтузіязмам гатовы працаваць адвакат, калі ўпершыню за дзевяць месяцаў ён атрымае магчымасць займацца тым, што любіць, і ўсё тваё жыццё, тваё далейшае жыццё – без перабольшання! – залежыць ад выніку.

Я вельмі ўважліва стаўлюся да сваёй справы. Увесь час цягам месяца штодня чытаў тэчкі, рабіў нататкі, маляваў дыяграмы і паказваў доказы неадпаведнасці абвінавачвання фактам.

Часам мне кажуць, што спадзявацца на бесстаронні працэс ці нават на прававую аснову справы – наіўна. Аднак на працягу ўсёй выбарчай кампаніі мы ўвесь час выкарыстоўвалі юрыдычныя магчымасці для абароны сваіх правоў, і я, вядома, гэтым разам таксама іх не прапушчу.

– Ці шкадуеце вы, што далучыліся да каманды кандыдата Віктара Бабарыкі на прэзідэнцкіх выбарах 2020 года?

– Я не хацеў бы, каб мае словы «я ні пра што не шкадую» гучалі як бравада, таму паспрабую патлумачыць прагматычна. У жыцці для таго, каб у нашым настроі, гэтым эмацыянальным калейдаскопе, пераважалі задавальненне і ўсведамленне таго, што зрабіў добра, а не шкадаванне і прыгнечанасць, дастаткова дзейнічаць прыстойна і дзеля дабра. Год таму я шмат працаваў дзеля дабра і на падставе законаў. Таму ў мяне чыстае сумленне наконт вартасці маіх дзеянняў.



Але адыдзем ад эмоцый дзеля логікі. Сёння як юрыст я ведаю, бо перажыў сам, што адбылося і чаго не адбылося падчас выбарчай кампаніі 2020 года. Праблемы, з якімі мы сутыкнуліся, былі глабальнымі, і яны важныя для ўсіх членаў грамадства.

Калі метафарычна задаць сабе пытанне: ці варта шкадаваць, што ты пайшоў у склеп і выявіў пажар, ці лепш ніколі не адчыняць дзверы і жыць у спакойным няведанні? Гэта не лепш, вядома. Я пра гэта не шкадую.

– Ці былі вы гатовыя да наступстваў сваёй ангажаванасці?

– 8 тысяч чалавек, якія падпісаліся ў маі 2020 года, каб далучыцца да ініцыятывы Віктара Бабарыкі, у тым ліку і я, тэарэтычна дапускалі магчымасць негатыўных наступстваў. Але наўрад ці хто мог прадказаць маштабы і асіметрыю рэпрэсій. Добраахвотнікаў у штабе нельга лічыць камбатантамі або рэвалюцыянерамі. Мы проста прыйшлі, каб удзельнічаць у выбарчай кампаніі з дапамогай законных метадаў і сродкаў, бо ў краіне былі абвешчаны выбары, і прыняць удзел мог кожны. Як і ў выпадку з агнём, схаваным у склепе, добра, што мы ўсё выявілі, і што далей ілюзій няма. Гэта добра, але надзвычай расчаравальна як тых, хто паддаўся ціску, так і тых, хто апынуўся ў спіралі падзення, хто даўно ўжо дасягнуў дна і, здаецца, працягвае падаць.

– Як вы думаеце, што павінны зрабіць міжнародныя суб екты, каб паўплываць на сітуацыю ў Беларусі?

– Ужо некалькі месяцаў у мяне няма доступу да поўнай інфармацыі пра тое, што адбываецца ў Беларусі, свеце, таму я не магу каментаваць, а хутчэй здагадвацца. Мне здаецца, што галоўнае пры выбары дзейнічаць – памятаць, хто канчатковы бенефіцыяр любой дапамогі, што ва ўсіх дзеяннях, якія павінны рабіць самі беларусы, яны з'яўляюцца мэтай, а не сродкам. Як ні дзіўна, 2021 год абвешчаны Годам нацыянальнага адзінства ў Беларусі. Так што нават маленькія крокі да кансэнсусу, вяртання да закону і да ісціны – гэта ўжо шмат. Я не ведаю, ці ёсць спосаб пачаць канструктыўны дыялог, а не імітацыйны дыялог, змяшаны з гвалтам. Але я думаю, што кожны дзень мы аддаляемся ад таго месца, дзе павінен быў пачацца наш шлях да нармальнасці.

(Радыё Свабода)

Народная Воля http://www.nv-online.info
6 ЖНІЎНЯ 2021 г.

РЕДКИЙ АДРЕС

РУЧНАЯ РАБОТА

В Молодечно делают баяны и продают их по всему миру.



В советские времена Беларусь обеспечивала музыкальными инструментами едва ли не весь Союз. Многие наверняка помнят фортепиано с названиями «Октава» и «Беларусь». Они были почти в каждой школе наравне с таллиннской «Эстонией». Выпускали в БССР цимбалы, балалайки и гитары.

А еще – баяны. Ими занимался Молодечненский завод музыкальных инструментов, в 80-х годах в его цехах собирали около 40 тысяч единиц в год. Но в 90-х госпредприятия не стало. Однако технологии производства народного инструмента в Молодечно все же удалось сохранить.

Я побывал на частной фабрике «Зонта» и нашел ответы на вопросы, почему белорусский баян не собирают на конвейере, сколько времени уходит на изготовление одного инструмента и почему в Европе так ценится «кнопочный аккордеон» из Молодечно.

Тонкая ручная работа

Своим возникновением баян вообще-то обязан гармони, она появилась более двух веков назад. Усилиями различных мастеров и многих поколений гармонь усложнили, улучшили и превратили в технически сложный механизм.

Когда прибываешь на фабрику «Зонта», сперва создается впечатление, что вся эта история об уникальности – самый обычный народный баян. Ну, нахваливают сами себя мастера, как говорится.

Невзрачное двухэтажное здание фабрики, часть помещений – в подвале. Производство как производство. Но вся суть – в деталях.

Из чего состоит баян?



«Деталей у баяна немало – около 2,5 тысячи. Потому и собрать такой инструмент – задача посильная не всем», – начинает беседу с нами начальник производства **Владимир Стасевич**.

Владимир Иванович показывает цеха. Небольшие комнаты, в которых трудится около 25 человек.

«Вот эти мужики создают сердце баяна – голосовые планки. В ней находятся металлические язычки, их может быть до 800 в одном инструменте. Каждый язычок крепится в планку, но с определенным зазором, от которого зависит звучание. Воздух проходит через зазоры – так и рождается звук», – рассказывает начальник производства.

В разговор вступает **Михаил Ситько**, музыкальный мастер, он как раз и занимается изготовлением планок. Сам он по образованию кларнетист. А с баянами работает уже 30 лет.



«Так получилось. Здесь обязательно слух нужно иметь – потому музыкальное прошлое очень выручает сейчас. Но и хорошие руки должны быть. Выточить аккуратно язычки, чтобы они звучали хорошо. Кстати, звучание своего баяна узнаю с закрытыми глазами», – рассказывает специалист.

На входе в его рабочую комнату – плакат с изображением известного белорусского баяниста Владислава Плиговки, с автографом.



«Он долго играл на моем инструменте. И многие конкурсы выиграл, кстати. Но сейчас уже играет не на «Зонте», а на «Scandalli» (баян итальянского производства)», – вспоминает Михаил Александрович.

Плиговка выиграл все, что устраивали в мире для баянистов, – конкурсы в Европе, США и Австралии. Среди них — чемпионат мира баянного искусства «Клингенталь». Победа на нем считается вершиной мастерства. Для предприятия же сотрудничество с Плиговкой – гордость, ведь такой именитый баянист начинал карьеру с их инструмента.

«И баянов одинаковых не бывает. Это штучный товар. Каждый заказчик требует свое звучание, – рассказывает особенности изготовления Михаил Ситько. – Россияне просят, чтобы громче звуки были, а итальянцы – потише, разливистее. Тем более на Западе хорошие залы и хорошая акустика».

Говорят, настроить баян сложнее, чем орган. Эта операция у мастера-настройщика может занимать и неделю.

Порвать меха?



Мастером по изготовлению мехов вот уже 22 года работает **Елена Монид**. С порога задаемся популярным вопросом: порвать меха можно?

«Можно, – смеется Елена. – Но нужно очень постараться. А вообще основа меха – картон. Специальный, плотный. Мы его связываем, обклеиваем, обшиваем тканью. А потом мех отлеживается две недели, и только тогда соединяем правый и левый корпус баяна».

Мастер показывает потрепанный мех, его принесли для ремонта. Подшучиваем: «Может, тещу так хоронили?»

«Все может быть, – юморит уже начальник производства Владимир Стасевич. – Хотя на нашей памяти такого не было. Но на праздниках меха рвали и потом в ремонт приносили – такое бывало!»

Сделай сам

На «Зонте» почти все детали делают сами. И корпуса, и резонаторы (в них потом вставляют голосовые планки). Если надо, то сошьют чехол для инструмента.



За механику левой и правой части баяна, кстати, отвечают разные цеха и разные специалисты. Здесь каждый заточен под что-то свое.

Материалы для деталей приходится в основном закупать за рубежом.

В токарном цехе из дерева выпиливают те самые резонаторы. Древесину либо заказывают в России, либо везут из Витебской области. Нужен либо бук, либо «резонансная ель».

«Она на севере растет, и плотность у нее особая. Белорусская обычная ель не годится. Мы даже из хорошего дерева до 50 процентов отбраковываем», – делится особенностями изготовления резонаторов столяр **Павел**.

Суперспециалисты

На предприятии все специалисты уникальны, заверяет руководство.

Тот же столяр Паша, заменить которого некем. Если он захочет уйти, то ему придется готовить вместо себя замену. Человек должен пройти обучение. И только когда освоит все тонкости, его могут принять на работу.



На особом счету и **Марина Чаевская**. На фабрике она облицовщик музыкальных инструментов. Работа вредная – приходится быть в отдельном помещении, в специальном респираторе.



Марина обклеивает баяны. Как говорит сама, создает их запоминающийся образ. Хотя заказчики почему-то предпочитают черный цвет, классический. На западе делают модели поинтереснее.

«Но если заказчик пожелает – мы тоже и цвет любой сделаем, захотите – и стразы наклеим, все что душе угодно», – отмечает мастер.

Материал для отделки инструмента – целлулоид. Его специально вымачивают 12 часов в растворе с ацетоном, благодаря чему он становится мягким, а значит – им уже можно обклеивать баян.

Финальная часть – шлифовка, после которой инструмент становится не матовым, а глянцевым.

От коронавируса спаслись!

На фабрике вспышки коронавируса, говорят, не было.

«Вовремя купировали, – отмахивается начальник производства Владимир Стасевич. – Переживали. Если кто-то заболеет из работников – сразу разрывается цепочка. И фабрика останавливается, а заказы выполнять нужно в срок».

Хотя итальянцы из-за пандемии до сих пор три своих баяна забрать не могут. Лежат на складе. Один инструмент ждет отправки и в Польшу. Но просто так баян не отправишь почтой – весит он немало, около 15 килограммов, а если при транспортировке бросят – звучание нужно будет перенастраивать.

Потому, как правило, инструмент забирает сам заказчик. Приезжает на предприятие – и вместе с настройщиком еще раз подгоняет звучание «под себя».

Стоимость баяна – как у автомобиля

На столе в отделе продаж стоит красивый черный баян «Зонта». Интересуемся – кому принадлежит. Оказалось, привезли из Дома культуры Мозырского НПЗ.

«Чтобы нефть под музыку лучше продавалась, – шутят работники. – А если серьезно, то что-то подрегулировать надо, вот они и вернули. Игрушка дорогая, эта стоит порядка 16 тысяч рублей. Поэтому мы и гарантию на 2 года даем, и специалиста на место отправим, если нужно, чтобы устранил неисправности или отрегулировал звук».

Ростислав Мойса, директор и совладелец фабрики, рассказывает, что на предприятии не гонятся за количеством заказов. Главное – качественное исполнение.

«Один баян делаем порядка 3 месяцев. От заготовок до упаковки», – рассказывает он.



Вспоминает руководитель и визит Анатолия Тозика, когда тот был вице-премьером.

«Он посмотрел, как мы работаем и что производим, и сказал, что после Великой Китайской стены это второе место, которое его поразило за долгие годы. Так что выводы сами делайте», – смеется Мойса.

В основном технику на фабрике покупают частные компании либо бюджетные структуры – музыкальные школы, колледжи, академии.

«Много работаем и с Россией. Отправляем инструменты в Италию, Германию, Францию, Польшу, были заказы в Аргентину и США», – говорит директор.

Перепродать баян в Европе

Руководитель фабрики рассказывает о том, что были случаи, когда перепродавали белорусские баяны.

«Мы итальянцам продали где-то за 7 тысяч евро инструмент. А через некоторое время на eBay видим его за 13 тысяч», – вспоминает случай Ростислав Иванович.

«А все почему? Потому что у них на фабриках похожие экземпляры будут стоить в несколько раз дороже», – резюмирует директор фабрики.

Он вспоминает и случай, когда в Китае у одного известного артиста украли баян производства «Зонта»:

«Оставил в поезде на полке, на гастролях был, лег спать, а проснулся – баяна нет, приглянулся кому-то!»

Баян vs аккордеон

На «Зонте» делают более 20 разновидностей баянов. Если надо – соберут гармонь. При желании – и аккордеон. Оказалось, что это и вовсе одна из нескольких в мире фабрик, которая выпускает аккордеоны с 55 нотами на правой клавиатуре. Почти как на рояле.

«Мы делаем аккордеоны системы Кравцова, профессора из Санкт-Петербурга. Это не баян и не аккордеон, а что-то среднее между ними», – говорит директор.

С его слов, аккордеон вообще проигрывает баяну в эргономике. На баяне можно сыграть почти все произведения, взять все октавы. У обычного аккордеона диапазон уже. Потому на него и спрос меньше.

Баян – состояние души?

Спрос на музыкальные инструменты, говорят на фабрике, не падает. Проблема в другом – современное поколение не слушает инструментальную музыку.

